http://edoc.bseu.by

*М.В. Стралец, д-р гіст. навук*
*БрДТУ (Брэст)*

# КУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА ПОСТСАВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЎНУТРЫБЕЛАРУСКІХ І ГЛАБАЛЬНЫХ РЭАЛІЙ

Кола пытанняў, якія перш за ўсё тычацца сучаснай беларускай культуры, уяўляецца такім. Першае пытанне: "Што новага з'явілася ў айчыннай культуры ў постсавецкі перыяд?" Другое пытанне: "Якія ўнутраныя дэтэрмінанты вызначаюць культурныя працэсы ў Рэспубліцы Беларусь?" Трэцяе пытанне: "Як выглядае культурны твар сучаснай Беларусі ў глабальным інтэр'еры?"

Адказ на першае пытанне: Беларусь стала поўнавартасным суб'ектам міжнародных культурных зносін.

Датычна другога пытання: галоўная ўнутраная дэтэрмінанта культурных працэсаў у нашай краіне ў 1991–2009 гг. – існаванне незалежнай беларускай дзяржавы. Другая па важнасці дэтэрмінанта – наяўнасць інстытутаў грамадзянскай супольнасці – поліаспектных і выключна культуралагічных.

Культурны твар сучаснай Беларусі ў глабальным інтэр'еры вызначаюць наступныя моманты.

*Першы.* У Спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКО ўключаны архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, замкавы комплекс у г. п. Мір, Белавежская пушча і геадэзічная дуга Струве. У стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца дасье па Аўгустоўскаму каналу, яшчэ дзевяць аб'ектаў нацыянальнага здабытку рэкамендаваны для ўключэння ў спіс экспертамі ЮНЕСКО.

*Другі.* Беларускі тэатр трывала ўпісаўся ў тканіну міжнародных культурных адносін. Айчынныя тэатры вядуць актыўную гастрольную дзейнасць, удзельнічаюць і заваёўваюць узнагароды ў прэстыжных міжнародных фестывалях, у ліку якіх Эдзінбургскі ў Вялікабрытаніі, Шылераўскі і Бонскае біеннале ў Германіі, Шэкспіраўскі ў Іспаніі, Чэхаўскі ў Расіі і шмат іншых. Цэнтрам тэатральнага жыцця міжнароднага маштаба перыядычна становіцца і сама Беларусь.

*Трэці.* У міжнародным інтэр'еры грунтоўна выглядае беларускае кіно. Кінастудыя «Беларусьфільм» – адна из вядучых ва Усходняй Еўропе. Тут паспяхова ажыццяўляюцца міжнародныя творчыя праекты па стварэнню мастацкіх фільмаў сумесна з кінематаграфістамі Расіі, Германіі, Ізраіля і інш.

Фільмы «Белвідэацэнтра» неаднойчы азначаліся прызамі і ўзнагародамі міжнародных кінафестываляў, такіх як, напрыклад, фестываль нацый у Аўстрыі, «Пасланне да чалавеку» (Санкт-Пецярбург), біеннале сучаснага мастацтва ў Цэнтры Пампіду (Парыж), «Залаты Віцязь» (Мінск, Масква) і інш. Вялікім поспехам на сусветных кінафорумах традыцыйна карыстаецца беларускае анімацыйнае кіно.

Падзеяй у рэспубліцы становіцца правядзенне аглядаў дасягненняў кінематаграфістаў розных краін. У 2007 годзе на конкурс X міжнароднага

фестываля «Анімаеўка» у Магілеве было атабрана 37 прац аніматараў з 12 краін. Удзельнікі буйнейшага кінофорума «Лістапад-2007» – кінематаграфісты 33 краін свету.

*Чацвёрты.* Шырокія маштабы набыў удзел нашай краіны ў міжнародных музычных фестывалях. Рэспубліка Беларусь пастаянна дэманструе здольнасць да арганізацыі падобных мерапрыемстваў на вышэйшым узроўні. Яскравае сведчанне таму – міжнародны музычны фестываль "Славянскі базар у Віцебску", які штогод праводзіцца пачынаючы з 1992 года.

*Пяты.* У розных краінах свету з відавочным поспехам праходзяць выставы айчынных мастакоў. Іх творы выклікаюць вялікую цікавасць з боку наведвальнікаў падобных выстаў.

Такім чынам, культурныя працэсы ў сучаснай Беларусі развіваюцца дынамічна. Яны пастаянна падпітваюцца моцнымі ўнутранымі дэтэрмінантамі, грунтоўна выглядаюць у кантэксце глабальных рэалій.

***В.Ф. Стульский, канд. филос. наук, доцент***
*Филиал БГЭУ (Бобруйск)*

## ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЕ СОЮЗЫ БЕЛАРУСИ В ПОЛИТИЧЕСКОЙ СИСТЕМЕ ПЕРЕХОДНОГО ТИПА: ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ

В политической системе белорусского общества профессиональные союзы всегда были самой массовой общественной организацией. И сегодня по своей структуре и количественному составу они представляют собой социальный срез нашего общества.

Федерация профсоюзов Беларуси (ФПБ) – самое крупное профсоюзное объединение трудящихся Беларуси, насчитывающее в своих рядах более 95 % экономически активного населения страны. В структуру ФПБ входит 29 отраслевых профсоюзов, Минское городское и 6 областных объединений профсоюзов. Наиболее многочисленными членскими организациями ФПБ являются профсоюзные объединения работников агропромышленного комплекса, образования и науки, здравоохранения.

Общая численность членов ФПБ составляет более 4 млн. человек. Кроме того, в Беларуси созданы и действуют свободные профсоюзы и профессиональный союз предпринимателей.

По своей сути профессиональные союзы призваны: обеспечивать защиту трудовых и социально-экономических прав и законных интересов своих членов; совершенствовать и развивать отношения социального партнерства трудящихся и работодателей; участвовать в разработке и контролировать реализацию республиканских и региональных государственных программ занятости, оздоровления трудящихся и членов их семей, других социальных программ.